# ДА ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАРУСІ

## АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ, СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Дарагія браты і сёстры, рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, працоўная інтэлігенцыя, юнакі і дзяўчаты, бясстрашныя і слаўныя партызаны і партызанкі!

Магутная Чырвоная Армія ў лістападзе месяцы спыніла наступленне нямецка-фашысцкай арміі на подступах да Масквы і Ленінграда, перайшла ў рашучае наступленне і нанесла сакрушальнае паражэнне нямецкім войскам.

Толькі ў час бегства з-пад Масквы за сорак дзён немцы страцілі забітымі каля 300.000 салдат і афіцэраў. За гэты час советскія войскі захапілі: 4.801 гармату, 3.071 мінамёт, да 8.000 кулямётаў, да 15.000 аўтаматаў, звыш 90.000 вінтовак, 2.766 танкаў, звыш 300 бронемашын, 33.640 аўтамашын, многа мільёнаў снарадаў, патронаў, мін і іншую ваенную маёмасць. За гэты ж час знішчана звыш 1.100 нямецкіх самалётаў. Немцы пацярпелі таксама паражэнне ў Крыму, пад Растовам, Тіхвінам, пад Калугай, Тулай, Лазавой, ля горада Калініна, Ельца, Вялікіх Лук, Таропца.

Пад Старай Русай акружана поўнасцю і знішчаецца часцямі Чырвонай Арміі 16-я нямецкая армія.

Чырвоная Армія наносіць бесперапынныя ўдары па ворагу, гоніць яго на захад і падышла шчыльна да граніц Беларусі. Некаторыя злучэнні перайшлі граніцу Беларусі, пачаўшы яе вызваленне ад нямецкіх катаў.

Нямецка-фашысцкая грабармія церпіць паражэнне за паражэннем і за свае няўдачы імкнецца адпомсціць мірнаму насельніцтву. Па загаду Гітлера адступаючая фашысцкая армія разбурае і паліць усе нашы сёлы і гарады, працаздольнае насельніцтва — мужчын і жанчын вывозіць у Германію ў канцэнтрацыйныя лагеры, ператвараючы іх у рабоў, асуджаючы на выміранне.

Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі, Совет Народных Камісараў і Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР звяртаюць да вас, працоўныя Беларусі, свае слова закліку.

Настаў час свяшчэннай і бязлітаснай расплаты з крывавым, ненавісным ворагам:

— За нашу зняважаную родную беларускую зямлю.

— За нашы родныя спаленыя і разграбленыя гарады і сёлы.

— За нашы родныя палі, сенажаці і лясы.

— За кроў нашых бацькоў, матак, братоў, сёстраў і дзяцей.

Усе, хто толькі можа насіць зброю, — ад малога да вялікага — паднімайцеся на свяшчэнную, усенародную барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў. — За нашу родную Советскую Беларусь. — За нацыянальную незалежнасць. — За шчасце нашых дзяцей!

Біце і бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў усюды: у вёсцы і горадзе, у лесе і ў полі. Не давайце ворагу спакою ні днём, ні ўночы. Пашырайце партызанскую барацьбу. Усямерна падтрымлівайце дзеянні партызанскіх атрадаў.

Кожны патрыёт радзімы, кожны калгаснік і рабочы, беспартыйны і комуніст, комсамолец і комсамолка павінен быць арганізатарам атрада, групы або баявой ячэйкі па знішчэнню фашыстаў.

У кожнай вёсцы і калгасе, сяле і мястэчку арганізуйце атрады народных мсціцеляў.

**Ваеннаабавязаныя, якія не паспелі быць адмабілізаванымі і адстаўшыя пры адступленні нашых часцей — уступайце ў партызанскія атрады.**

Разбурайце тыл ворага і яго камунікацыі. Падрывайце масты, чыгункі. Узрывайце і падпальвайце базы, склады з гаручым і боепрыпасамі. Знішчайце тэлефонную і тэлеграфную сувязь.

Захоплівайце і выкарыстоўвайце супроць ворага яго-ж уласную тэхніку.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі **П. ПАНАМАРЭНКА.**

Старшыня Соўнаркома Беларускай ССР **І. БЫЛІНСКІ.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР **Н. НАТАЛЕВІЧ.**